Касцёл Святой Тройцы ў Росі. Шэдэўр італьянскай скульптуры

Аўтар: Рэдакцыя
24.07.2022 00:00



Назва гарадскога пасёлка Рось, безумоўна, паходзіць ад назвы ракі, на берагах якой ён размяшчаецца. А сама назва ракі Рось, як лічаць некаторыя даследчыкі, мае ў сваёй аснове старажытны індаеўрапейскі корань “рос”, што абазначае “сыры”, “вільготны”.

Аўтар: Рэдакцыя
24.07.2022 00:00

Цяжка нават сказаць, колькі народаў жыло на берагах гэтай невялікай рэчкі. Вядома толькі, што яна з даўніх часоў была важным транспартным шляхам. Тут нярэдка знаходзяць старажытнарымскія манеты, якія сведчаць, што на Росі размяшчаліся гандлёвыя пункты, куды прыбывалі купцы з вельмі далёкіх краёў. Першая згадка пра Рось у дакументах адносіцца да 1491 года. Праз некаторы час у мясцовасці з'явілася праваслаўная царква.

Заснавалі яе прадстаўнікі роду Хадкевічаў, якія тады былі вялікімі прыхільнікамі праваслаўя і заснавалі вядомы манастыр у Супраслі недалёка да Беластока. Хадкевічы неўзабаве прынялі каталіцтва, і недзе пад канец XVI стагоддзя ў Росі з'явіўся таксама касцёл. Ад фундатараў мясцовыя ксяндзы (плябаны) атрымалі маёнтак Гарасімаўшчына, дзе і жылі, наведваючы касцёл толькі для службаў. У XVII – першай палове XVIII стагоддзя Россю валодалі Ракоўскія, Агінскія, Сапегі. Апошнія нават планавалі збудаваць для манаскага ордэна піяраў мураваныя касцёл і кляштар. Аднак да будоўлі справа не дайшла.

У 1752 годзе Тэрэза Сапега выйшла замуж за Яўхіма Караля Патоцкага, і так Рось на доўгі час стала ўласнасцю Патоцкіх. Менавіта яны і ўзяліся за пабудову мураванай святыні. Будаваў яе галоўным чынам Пётр Патоцкі – дыпламат, ваенны дзеяч, гарачы прыхільнік Канстытуцыі 3 мая 1791 года. Завяршыў будаўніцтва святыні яго сын Фелікс.

Касцёл Святой Тройцы ў Росі. Шэдэўр італьянскай скульптуры

Аўтар: Рэдакцыя
24.07.2022 00:00



Аўтар: Рэдакцыя
24.07.2022 00:00

